11.06.2026 № 323-ОС

Аб правядзенні гарадскога этапу конкурсаў рэспубліканскай акцыі «Тут пачатак Радзімы маёй»

У адпаведнасці з планам работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на 2026 год, пісьмом Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Аб правядзенні рэспубліканскай краязнаўчай акцыі «Тут пачатак Радзімы маёй» ад 05.03.2026 № 06-01-24/2824/дс, з мэтай удасканалення дзейнасці ўстаноў адукацыі па патрыятычным выхаванні дзяцей і навучэнскай моладзі праз актыўнае ўключэнне іх ва ўсебаковае вывучэнне гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны малой радзімы
ЗАГАДВАЮ:

1. Установе адукацыі «Мінскі дзяржаўны турысцка-экалагічны цэнтр дзяцей і моладзі» (Краўчук С.В.) арганізаваць і правесці з 16 чэрвеня па 30 лістапада 2026 года гарадскі этап конкурсаў рэспубліканскай акцыі «Тут пачатак Радзімы маёй» (далей – конкурсы акцыі).

2. Зацвердзіць прыкладзеныя:

2.1. склад арганізацыйнага камітэта;

2.2. склад журы;

2.3. Палажэнне аб правядзенні гарадскога этапу конкурсаў акцыі (далей – Палажэнне).

3. Начальнікам упраўленняў па адукацыі адміністрацый раёнаў г. Мінска, дырэктарам устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі і ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі арганізаваць удзел навучэнцаў устаноў адукацыі ў конкурсе ў адпаведнасці з Палажэннем, зацверджаным пунктам 2 загада.

4. Кантроль за выкананнем дадзенага загада ўскласці на першага намесніка старшыні Ляхновіч Л.Р.

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ
Комитет по образованию Мингорисполкома
ДЛЯ ДОКУМЕНТОВ

Старшыня М.А.Ільіна